ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні аргкамітэта
III (абласнога) этапу
рэспубліканскай алімпіяды,
намеснік начальніка ўпраўлення
адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
__________ С.В.Лявонава
“ 3 ” лістапада 2011 года

**Заданні**
**для правядзення II (раённага) этапу**
**рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры, 2011/2012 н. г.**

**Комплексная работа**

**9 клас**

1.1. Запішыце сказы з верша Алеся Пісьмянкова ў форме вершаванай страфы, расстаўце знакі прыпынку. Максімальная колькасць балаў – 10.

*Узмакрэлы і босы бронзавы ад загару стомлены сенакосам ліпень прылёг памарыць. Мёдам на ўсю Еўропу пахнуць стагі і копы.*

1.2. Уключыце сваё ўяўленне! Вызначце мастацкія тропы, якія дазволілі аўтару стварыць паэтычны малюнак.

1.3. Зрабіце разбор першага сказа па членах (графічна) і дайце яго характарыстыку.

1.4. Вызначце ролю інверсіі ў другім сказе.

2. Вызначце ўсе магчымыя лексічныя значэнні слоў ЁЛКА, ЧАРНІЦА. Максімальная колькасць балаў – 5.

3. Вызначце ў кожным радзе чацвёртае лішняе слова з пункту погляду марфемнай будовы ці словаўтварэння, аргументуйце свой выбар (можна графічна). Максімальная колькасць балаў –10.

*а) настаўніца, пісьменніца, піражніца, школьніца;*
*б) абабегчы, абабіць, абагаціць, абагнаць;*
*в) вадакачка, мясарубка, сіласарэзка, снопавязалка;*
*г) прыхільнік, талерачнік, піхтоўнік, мазаічнік;*
*д) каласіцца, апранацца, мыцца, вучыцца.*

4. Як размяркуюцца наступныя словы ў залежнасці ад наяўнасці Е або Ё каранёвай? 5 балаў.

*Галал...дзіца, та...жны, камбайн...р, ман...ўр, ц...шча, шл...м, та...мны, чацв...рты, аднайм...нны, м...даварэнне.*

| Е | Ё |
|---|---|
| | |

5. Узнавіце беларускія народныя параўнанні, злучыўшы пачатак і канец выслоўяў. 4 балы.

*Узор адказу: 1-А, 2-Б, 3-В...*

| | | |
|---|---|---|
| *1.Надзьмуўся*<br>*2.Трапіў*<br>*3.Баіцца*<br>*4.Бегае*<br>*5.Вые*<br>*6.Лезе*<br>*7.Ляпнуў*<br>*8.Маўчыць* | ***як*** | *А) аса ў вочы*<br>*Б) воўк у піліпаўку*<br>*В) мыш на крупы*<br>*Г) воцату выпіўшы*<br>*Д) воўк ягняці*<br>*Е) лісіца ў саладуху*<br>*Ж) лапцем па балоце пляснуў*<br>*З) з вуглямі ў нагавіцах* |

6. Выкажыце свае адносіны ("ТАК" ці "НЕ") да кожнага са змешчаных ніжэй сцвярджэнняў. Максімальная колькасць балаў – 6.

*а)* ***Ва ўсіх спалучэннях падкрэсленая літара І абазначае гук [Ы]:*** *з Ігнатам, гіперінфляцыя, стол і стул, дождж імжыць, Павел Іванавіч;*

*б)* ***ва ўсіх словах колькасць літар і гукаў не супадае:*** *ісландцы, па-іхняму, ад інсульту, на рэчцы, ледзьве;*

*в)* ***усе словы ў гэтым радзе з фанетычным падаўжэннем:*** *ладдзя, ззянне, застрэшша, каменны, каменне.*

7. Мова – феномен культуры, у якім знайшлі адлюстраванне яе праяўленні. Вам прапануецца шэраг нацыянальна маркіраваных намінатыўных адзінак, якія абазначаюць рэаліі матэрыяльнай культуры беларусаў. Размяркуйце гэтыя словы па групах паводле іх значэння. 8 балаў.

*Аблавуха, Грамніцы, куфар, бурнос, кабат, брыль, улазіны, дажынкі, панёва, апоркі, пасталы, намітка, жорны, зэдлік, верашчака, шнуроўкі, дранікі, басэтля, нерат, узвар, выцінанка, абцугі, жалейка, кляшчоткі.*

| | |
|---|---|
| *Назвы абрадаў і свят* | |
| *Назвы прадметаў інтэр'ера* | |
| *Назвы традыцыйнага адзення* | |
| *Назвы абутку* | |
| *Назвы галаўных убораў* | |
| *Назвы страў нацыянальнай кухні* | |
| *Назвы прылад працы* | |
| *Назвы музычных інструментаў* | |

8. Ніжэй прыведзены тры фрагменты вершаваных твораў. Два з іх належаць аднаму аўтару і ўзяты з аднаго твора. Прачытайце і адкажыце на пытанні. 7 балаў.

*1) І ён доўга, нерухомы,*
*Там стаіць і ўсё глядзіць*
*У край светлы, невядомы,*
*Дзе знікае тая ніць*

*Вольных птушак на*
*ўсю зіму...*
*Ну, прашчайце да вясны!..*
*Поле, неба прад вачыма,*
*І ўжо крыкі не чутны.*

*2) Не такі, як усе дзеці,*
*Нейкі вырадак, дзіўны,*
*Нёс віну за ўсё на свеце,*
*Вінаваты без віны.*

*З ім і дзеці не дружылі,*
*Не прымалі да гульні,*
*І ў самоце прахадзілі*
*Веснавыя яго дні.*

*3) Так страшным стала яго імя*
*На ўсю ваколіцу з тых дат*
*Паміж сваімі і чужымі,*
*Як страшны імем сваім кат.*

*З сваёй бярлогі на дарогу*
*Вылазіў грозны з булавой,*
*Як пошасць, сеяў скрозь трывогу,*
*Загоны росячы крывёй.*

а) Назавіце №№ цытат з аднаго тэксту ______________________________

б) Як называецца твор? ____________________________________________

в) Укажыце яго жанр _______________________________________________

г) Хто яго аўтар? __________________________________________________

д) Назавіце сапраўднае імя аўтара ________________________________

е) Хто аўтар трэцяй, не звязанай з вызначанымі ў папярэдніх заданнях, цытаты?

ж) Назавіце імя галоўнага героя гэтага твора ______________________________